ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 19 (191) | Субота, 25 мая 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНСІІ Ў АКАДЭМІІ НАВУК БССР

**У мінулы аўторак адбылося сумеснае пасяджэнне Вучонага савета і партыйнага камітэта ўніверсітэта, на якім разгледжана пытанне аб вылучэнні кандыдатуры для ўдзелу ў выбарах на замяшчэнне вакантных месц у Акадэміі навук Беларускай ССР.**

**Пасяджэнне адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце, дацэнт Д. А. Лявончанка. Ён паведаміў аб тым, што АН БССР аб'явіла выбары акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў на вакантныя месцы. Дзмітрый Андрэевіч прапанаваў вылучыць кандыдатуру рэктара нашага ўніверсітэта, доктара фізіка-матэматычных навук Б. В. Бокуця для ўдзелу ў выбарах на замяшчэнне вакансіі члена-карэспандэнта па спецыяльнасці «Тэарэтычная фізіка».**

**Выступае доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар У. П. Рвачоў, які характарызуе Б. В. Бокуця як буйнога вучонага, маючага на сваім рахунку больш 70 каштоўных навуковых прац тэарэтычнага і прыкладнога значэння. Прамоўца зазначае, што рэктар нашага ўніверсітэта заслугоўвае высокага звання члена-карэспандэнта АН БССР не толькі за свае грунтоўныя навуковыя даследаванні, але і за выдатныя арганізатарскія і чалавечыя якасці.**

**Высокая ацэнка навуковай, адміністрацыйнай і грамадскай дзейнасці Б. В. Бокуця была дадзена ў выступленнях в. а. дэкана фізічнага факультэта, кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта У. М. Старыкава, кандыдата фізіка-матэматычных навук А. М. Сердзюкова, прафесара М. М. Грынчыка, сакратара парткома У. В. Казлова, дацэнта кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму Я. А. Семянчука.**

**На пасяджэнні Вучонага савета і парткома аднадушна прынята пастанова вылучыць рэктара нашага ўніверсітэта, доктара фізіка-матэматычных навук Барыса Васільевіча Бокуця на ўдзел у выбарах на замяшчэнне вакансіі члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР па спецыяльнасці «Тэарэтычная фізіка».**

## НА АПОШНЯЙ, 1201-й ЛЕКЦЫІ

18 мая гаспадарамі актавай залы ўніверсітэта былі выпускнікі гісторыка-філалагічнага факультэта. Яны прыйшлі сюды па святочнаму апранутыя, з кветкамі ў руках. Тут праходзіла апошняя, сімвалічная 1201-я лекцыя, на якую з'явіліся таксама выкладчыкі — тыя, хто на працягу пяці год шчодра перадаваў свае веды будучым маладым спецыялістам.

Гонар чытаць заключную лекцыю выпаў на долю загадчыка кафедры беларускай літаратуры, члена Саюза пісьменнікаў БССР, прафесара М. М. Грынчыка. Каб лекцыя найбольш адпавядала ўрачыстаму моманту, Мікалай Міхайлавіч назваў яе «На ростанях». Словы пра педагагічнае майстэрства, шчасце і святочнасць абставін як бы перанеслі кавалачак сонечнай вясны з вуліцы ў залу. Прафесар з хваляваннем даў наказ сёлетнім выпускнікам у вялікае, самастойнае жыццё, пажадаў ім поспехаў у нялёгкай, але вельмі пачэснай справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

Пасля лекцыі празвінеў сімвалічны званок.

Дэкан факультэта, дацэнт Т. І. Язэпава выказала ўпэўненасць у тое, што выпускнікі гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ усюды, дзе ім не давядзецца працаваць, будуць даражыць гонарам свайго роднага ўніверсітэта. Тамара Ігнатаўна паведаміла, што на факультэце заведзена Кніга гонару. Першымі ў яе занесены прозвішчы равеснікаў універсітэта, лепшых выпускнікоў М. Старавойтава, У. Коваля, Л. Злобінай, Г. Філіпавай, Л. Вайцянок.

Выступае загадчык кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, дацэнт Г. С. Еўдакіменка. Ён звяртае ўвагу на асаблівую адказнасць настаўнікаў-гісторыкаў у выхаванні дастойнай змены сваіх бацькоў. Георгій Савіч успамінае выпускнікоў папярэдніх гадоў, многія з якіх ужо сталі партыйнымі і савецкімі работнікамі, старшынямі калгасаў, вучонымі, выдатнымі педагогамі.

Выкладчыца кафедры рускай літаратуры Л. К. Няронская ахарактарызавала ролю настаўнікаў мовы і літаратуры ў школе, усяліла ім упэўненасць у свае веды.

З успамінамі і ўражаннямі ад гадоў вучобы выступіў адзін з лепшых выпускнікоў універсітэта У. Коваль. Валодзя шчыра дзякаваў выкладчыкаў за іх стараннасць і працавітасць.

У знак глыбокай павагі да сваіх педагогаў выпускнікі прыпаднеслі ім букеты цюльпанаў.

На ўрачыстасці з найлепшымі пажаданнямі выпускнікам выступілі сакратар камітэта камсамола Тамара Ільянкова і ад імя сваіх аднакурснікаў — Людміла Дземянцей.

Да памятнай падзеі былі прымеркаваны ўзнагароды лепшым выпускнікам. Яны былі ўручаны за поспехі ў навукова-даследчай рабоце, выдатную вучобу, актыўную грамадскую дзейнасць М. Старавойтаву, Н. Сінягоўскай, У. Ковалю, Л. Злобінай, Г. Бадалей, Г. Філіпавай, П. Раманенку і іншым.

Ад імя першакурснікаў Наташа Хварасціна звярнулася да выпускнікоў з заклікам плённа працаваць на высакароднай педагагічнай ніве і выказала ім найлепшыя пажаданні.

**К. УСОВІЧ,**
**наш кар.**

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВЛКСМ ЗАКЛІКАЕ ЎСІХ МАЛАДЫХ ВЫБАРШЧЫКАЎ ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ВЫБАРАХ, АДДАЦЬ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА НЕПАРУШНЫ БЛОК КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ.**




**У першым вучэбным корпусе нашага ўніверсітэта размясціўся агітпункт выбарчага ўчастка № 23/141. Кожны дзень тут бываюць наведвальнікі. Людзі прыходзяць, каб азнаёміцца з літаратурай аб савецкай выбарчай сістэме, атрымаць кансультацыі, вырашыць якое-небудзь іншае пытанне, ці проста папрысутнічаць на цікавай гутарцы.**

**НА ЗДЫМКУ:** у пакоі агітпункта.

Фота **А. РУДЧАНКІ.**

## НАТХНЯЮЧЫЯ ЗВАРОТЫ

Звароты ЦК КПСС, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ да выбаршчыкаў выклікалі асаблівы водгук у савецкіх людзей, у тым ліку нашай моладзі.

Для нас, сёлетніх выпускнікоў, гэты год асабліва знамянальны. Мы атрымалі накіраванні на працу.

Апошні раз мы будзем галасаваць ва ўніверсітэце. Мы павінны вызначыцца на сёлетніх выбарах адзінствам і згуртаванасцю, з гонарам апраўдаць давер'е роднай партыі і аддаць галасы за самых дастойных сыноў і дачок савецкага народа.

**Ул. КОВАЛЬ,**
**выпускнік універсітэта.**

## У ПАРТКОМЕ

22 мая адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта ўніверсітэта. Сярод разгледжаных пытанняў была справаздача сакратара партыйнага бюро гісторыка-філалагічнага факультэта У. М. Сабаленкі «Аб рабоце партбюро і дэканата па грамадска-палітычнай рабоце са студэнтамі». З садакладам выступіў член парткома І. Ф. Харламаў.

У прынятай пастанове па гэтаму пытанню адзначаны некаторыя поспехі, якія дасягнуты за апошні час на гісторыка-філалагічным факультэце ў палітыка-выхаваўчай рабоце студэнтаў, уцягненню іх у больш актыўную грамадскую дзейнасць, а таксама ўказана на істотныя недахопы. Для іх ухілення партбюро і дэканат абавязаны прыняць адпаведныя меры.

Аб рабоце партгрупы кафедры рускай літаратуры парткому дакладвала партгрупорг Л. С. Кудраўцава. З садакладам выступіла член парткома Л. М. Панкова. Прынята пастанова для павышэння ролі партгрупы ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці камуністаў і вырашэнні іншых задач, якія стаяць цяпер перад вышэйшай школай.

На пасяджэнні партыйнага камітэта зацверджаны камандзіры і камісары студэнцкіх будаўнічых атрадаў і састаў атрада, які будзе працаваць у Чэхаславакіі.

## НОВЫЯ ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

Савет Міністраў СССР устанавіў новыя імянныя стыпендыі імя Джона Бернала і Фрэдэрыка Жоліо-Кюры. Яны будуць прысуджацца лепшым савецкім студэнтам-фізікам вядучых універсітэтаў і інстытутаў краіны. Такіх стыпендый устаноўлена чатыры (адпаведна па дзве ў гонар англійскага і французскага даследчыкаў). Памер кожнай стыпендыі — 75 рублёў у месяц.

Ужо ў гэтым годзе, па выніках вясенняй экзаменацыйнай сесіі, новыя стыпендыі атрымаюць студэнты-фізікі, якія сумяшчаюць выдатную вучобу і плённую даследніцкую дзейнасць у студэнцкім навуковым таварыстве. Пры адборы кандыдатур будзе ўлічвацца і актыўны ўдзел студэнта ў грамадскай рабоце і маладзёжным руху.



**На мінулым тыдні споўнілася 60 гадоў старшаму выкладчыку, заслужанаму трэнеру Беларускай ССР Якаву Трафімавічу Церашкаўцу. Ушанаванне юбіляра адбылося на Вучоным савеце факультэта фізічнага выхавання, дзе з дня адкрыцця факультэта вось ужо 25 гадоў працуе ветэран фізічнай культуры.**

**Шмат шчырых і цёплых слоў было выказана Якаву Трафімавічу ў гэты дзень. Яму былі ўручаны памятныя адрасы.**

**НА ЗДЫМКУ: памятны адрас рэктарата, парткома і мясцкома ўручае юбіляру прарэктар па вучэбнай рабоце, дацэнт Д. А. Лявончанка.**

## ПЕРАД ВЫБАРАМ ДАРОГІ Ў ЖЫЦЦЁ

Для выпускнікоў сярэдніх школ надыходзіць гарачая пара — экзамены. Але не толькі яны хвалююць цяпер юнакоў і дзяўчат, перад якімі хутка адкрываюцца ўсе дарогі ў самастойнае жыццё. Не менш, чым экзамены, непакоіць пытанне: якім пайсці шляхам, якую набыць прафесію, каб ніколі не расчаравацца ў ёй, а быць заўсёды задаволеным, прыносіць як мага большую карысць свайму народу, Радзіме.

У час роздумаў вельмі карыснымі з'яўляюцца для выпускнікоў «Дні адкрытых дзвярэй», якія сталі традыцыйнымі ў ГДУ.

Асабліва мнагалюдна было на «Дні адкрытых дзвярэй» 19 мая. На сустрэчу з будучымі абітурыентамі прыйшлі дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр, выкладчыкі, старшакурснікі. Адказны сакратар прыёмнай камісіі дацэнт І. П. Трацэўскі пазнаёміў гасцей з прафесарска - выкладчыцкім саставам, падрабязна расказаў пра ўніверсітэт, умовы паступлення на вучобу і інш.

Сакратар камітэта камсамола Тамара Ільянкова ў сваім выступленні гаварыла пра вучобу і жыццё студэнтаў, пра іх заняткі ў разнастайных гуртках, актыўны ўдзел у грамадска-карыснай рабоце.

Загадчык кафедры спартыўных гульняў і гімнастыкі, дацэнт А. Ф. Сямікоп расказаў аб дасягненнях універсітэта ў пастаноўцы спартыўна - масавай работы, назваў прозвішчы многіх вядомых спартсменаў, якія былі выхаваны ва ўніверсітэце.

Прысутныя на «Дні адкрытых дзвярэй» пазнаёміліся з вучэбнымі корпусамі ўніверсітэта, агледзелі лабараторыі, сучасную тэхніку, прыборы і абсталяванне, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе.

Рабяты задавалі шмат пытанняў і на кожнае з іх атрымоўвалі вычарпальныя адказы.

Многія з тых, хто наведаў ГДУ ў «Дзень адкрытых дзвярэй», абавязкова прыйдуць сюды, каб выпрабаваць свае веды на конкурсных экзаменах і паступіць на вучобу ў вядучую вышэйшую навучальную ўстанову беларускага Палесся.

СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ

## БІЁЛАГА-ГЛЕБАВЫ ФАКУЛЬТЭТ



## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ ПАТРЭБНАЯ І ЦІКАВАЯ

Біялогія — адна з важнейшых і цікавейшых навук. Яна вырашае такія важныя і складаныя пытанні, як кіраванне працэсамі біясінтэзу бялка, біялагічнай несумяшчальнасцю тканак, перадачай спадчыннай інфармацыі ад бацькоў патомству і г. д.

Выключная важнасць гэтых праблем тлумачыцца тым, што ад іх вырашэння ў вядомай ступені залежыць лёс чалавецтва.

Па выказванню многіх вучоных свету цяперашняе стагоддзе з'яўляецца стагоддзем біялогіі, падобна таму, як мінулае было векам фізікі.

Выкладанне агульнатэарэтычных і спецыяльных дысцыплін на факультэце ажыццяўляюць пяць кафедр: батанікі, заалогіі і дарвінізму, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёлы, хіміі. Наш факультэт рыхтуе на стацыянарным і завочным аддзяленнях спецыялістаў біялагічнага профілю.

Акрамя агульнатэарэтычных дысцыплін, студэнты вывучаюць шэраг цікавых курсаў спецыялізацыі: уздзеянне біялагічна актыўных злучэнняў на ўраджай сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасць жывёлы, арніталогію, жывёльны і раслінны свет Палесся, фізіялогію цэнтральнай нервовай сістэмы і інш.

На нашым факультэце працуюць вопытныя выкладчыкі, сярод якіх тры доктары навук, прафесары, 16 кандыдатаў навук, дацэнтаў.

Пачынаючы з першага курса, студэнты актыўна ўдзельнічаюць у выкананні навукова - даследчых работ, гаспдагаворных і дзяржбюджэтных тэм на грамадскіх пачатках.

Выключна вялікае значэнне ў падрыхтоўцы і фарміраванні будучых спецыялістаў маюць вучэбныя і вытворчыя практыкі. Студэнты праходзяць іх на аграбіялагічнай станцыі «Чонкі», размешчанай у адной з самых маляўнічых мясцін Гомельшчыны, і ў Прыпяцкім дзяржаўным запаведніку. Студэнты, якія спецыялізуюцца па фізіялогіі чалавека і жывёлы, праходзяць вытворчую практыку ў Інстытуце фізіялогіі Акадэміі навук БССР і сектары гаранталогіі.

У час практыкі студэнты не толькі знаёмяцца ў прыродных умовах з раслінным і жывёльным светам вызначаных глебава-кліматычных зон ,а таксама вядуць навуковыя даследаванні, збіраюць, сістэматызуюць і калекцыянізуюць матэрыял для курсавых работ.

Пасля заканчэння нашага факультэта маладыя спецыялісты накіроўваюцца на працу ў школы і сярэднія спецыяльныя ўстановы. Яны маюць права працаваць таксама ў навукова-даследчых установах, запаведніках, тэхнікумах і вну, на доследных станцыях.

Выпускнікі, якія актыўна займаліся ў працэсе вучобы навукова-даследчай працай і паказалі выдатную тэарэтычную падрыхтоўку, могуць працягваць адукацыю ў аспірантуры пры кафедрах батанікі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёлы.

Спадзяемся, што на наш факультэт прыйдзе нямала абітурыентаў. Лепшыя з лепшых на конкурсных экзаменах заваююць права стаць першакурснікамі і пачнуць настойліва авалодваць гэтай цікавай і вельмі патрэбнай у цяперашні час спецыяльнасцю.

**С. АЛЕШКА,**
**дэкан факультэта, дацэнт.**



**Каб стаць добрым спецыялістам, глыбока засвоіць увесь вучэбны матэрыял, студэнтам факультэта даводзіцца шмат часу праводзіць у лабараторыях, дзе створаны ўсе ўмовы для разнастайных доследаў.**

**На здымку вы бачыце другакурсніцу Галіну Чармашэнцаву на практычных занятках у лабараторыі фізкалоіднай хіміі.**

Фота **А. Рудчанкі.**

## ЧАКАЕМ ДАСТОЙНАЙ ЗМЕНЫ

Намі, чацвёртакурснікамі, здадзена перадапошняя сесія. Засталося вучыцца ўсяго толькі адзін год. Як хутка праляцеў час вучобы! Здаецца зусім нядаўна здавалі ўступныя экзамены, потым была першая «бульба», першая сесія...

Цяпер з поўным правам можна сказаць, што гэта былі вельмі цікавыя, вясёлыя, насычаныя вялікімі справамі гады.

Колькі мы даведаліся, колькі ўбачылі! Гэта — як пабудавана клетка, арганізм, якія бываюць расліны і жывёлы, як праходзіць сінтэз бялка і г. д. Мы дэталёва вывучылі Прыроду. На нашым факультэце створаны ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб атрыманыя веды былі грунтоўнымі, трывалымі, на сучасным узроўні.

Доўга нам будзе ўспамінацца вучэбна-палявая практыка на аграбіястанцыі ў Чонках. Тут мы непасрэдна назіралі за тым, пра што даведаліся на лекцыях і з падручнікаў. Практыка — гэта, бадай, адзін з самых цікавых перыядаў вучобы. Жыццё ў палатках, экскурсіі ў прыроду заўсёды прыносяць вялікае задавальненне. А колькі вясёлых і кур'ёзных выпадкаў!

Наогул, студэнты нашага факультэта вядомы ва ўніверсітэце як адны з самых вясёлых. Дастаткова ўспомніць, колькі смеху было на конкурсных вечарах мастацкай самадзейнасці. Каманда КВЗ біяфака — лепшая ў ГДУ.

Цяжка ўявіць сучаснага студэнта, які б не займаўся навукова-даследчай работай, не прымаў актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Многія нашы студэнты праводзяць вельмі цікавыя і важныя даследаванні, выступаюць са сваімі дакладамі на студэнцкіх навуковых канферэнцыях ва ўніверсітэце і розных вну краіны.

Студэнты-біёлагі маюць на сваім рахунку шмат карысных спраў. Пра ўсё нават цяжка адразу расказаць. Ды ў гэтым і няма патрэбы. Хто паступіць да нас на вучобу, ва ўсім пераканаецца сам. Я толькі яшчэ раз зазначу, што вучыцца на нашым факультэце вельмі цікава, але не лёгка. Тут могуць набываць прафесію толькі тыя, хто любіць прыроду, па-сапраўднаму аддадзены ёй.

Мы чакаем менавіта такога папаўнення.

**А. ЯРМІШЫН,**
**студэнт чацвёртага курса, ленінскі стыпендыят.**

## У ДРУЖНАЙ СТУДЭНЦКАЙ СЯМ'І

Маўкліва нясуць сваю нязменную вахту маладыя беластволыя бярозкі каля прыгожага будынка. Крыху паводдаль — парк і другі вучэбны корупс, патанаючы ў зеляніне.

Хоць і бачыш гэта кожны дзень, але чамусьці неназдзіўляешся, не налюбуешся акаляючай цябе прыгажосцю. Проста сціскаецца сэрца, калі падумаеш, як дарага і блізка стала ўсё гэта для цябе, як моцна яно ўвайшло ў тваё жыццё.

Мы — біёлагі, і, магчыма, ад таго так тонка рэагуем на тое, што для іншых здаецца звычайным. Наш жа факультэт і прырода —неаддзельны адзін ад другога.

Сёлетняя вясна — першая, якую я сустрэла з іншымі першакурснікамі ва ўніверсітэце. Усім нам нялёгка было развітвацца са школай, з добрымі і шчырымі сябрамі. Але, калі б нам было суджана стаць на год маладзей, ніхто б з нас не пайшоў на іншы факультэт. Магчыма, гэта ў каго-небудзь выкліча ўсмешку, але я заўсёды здзіўляюся, наколькі добразычліва і з якой цеплынёй адклікаюцца мае сябры пра родны факультэт.

Вучыцца ў нас вельмі цікава. Акрамя спецыяльных дысцыплін, мы абагачаем свае веды па фізіцы, матэматыцы, гісторыі і іншых неабходных цяпер навуках. Мікраскоп дазволіў нам зазірнуць у здзіўляючы і непаўторны свет мікраскапічных жывёлін і раслін.

Нашы будні іншы раз бываюць і суровыя. Цяжка ў час залікаў, экзаменаў. Але ніхто не «скрыпіць». Кожны з вялікім жаданнем і настойлівасцю авалодвае выбранай прафесіяй.

Першы год вучобы прамільгнуў зусім непрыкметна. Цяпер такое адчуванне, што ты на факультэце зусім не навічок, а вучышся тут ужо даўно. Там, кажуць, дзе дружная, з'яднаная студэнцкая сям'я, заўсёды так бывае.

**І. БАСАВА,**
**студэнтка групы Б-11.**



**Гэты здымак быў зроблены 19 мая, калі ва ўніверсітэце праводзіўся традыцыйны «Дзень адкрытых дзвярэй». Сярод будучых абітурыентаў, а цяпер яшчэ школьнікаў, было нямала жадаючых паступіць на біёлага-глебавы факультэт. Яны сустрэліся з вучонымі і выкладчыкамі, якія падрабязна расказалі рабятам пра прафесію біёлага, пазнаёмілі іх з вучэбнымі лабараторыямі.**

**НА ЗДЫМКУ: дэкан факультэта, дацэнт Сцяпан Фёдаравіч Алешка знаёміць тых, хто марыць стаць біёлагам, з гэтай спецыяльнасцю. Размова ідзе ў кабінеце методыкі біялогіі.**

**НА АХОВЕ ПРЫРОДЫ**

## УДАРНАЯ СПРАВА

Летась на факультэцкім сходзе ў прынятай пастанове мы запісалі: «Лічыць Дружыну па ахове прыроды ўдарнай справай камсамольцаў біёлага-глебавага факультэта». У той час нашай Дружыне быў толькі адзін год.

Цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што справа Дружыны — ударная. Ды інакш і і быць не можа. Ідэі аховы прыроды нам, біёлагам, блізкія як нікому іншаму. І Дружына сваёй двухгадовай дзейнасцю даказала, што мы можам унесці свой уклад у работу агульнанароднай і дзяржаўнай важнасці.

У нас вялікія планы, шмат карысных і цікавых задум. Мы верым у будучыню нашай Дружыны. Гэта значыць, што мы верым і ў вас, сённяшнія абітурыенты а заўтрашнія студэнты нашага факультэта. Вы дастойна павінны прыняць эстафету з нашых рук і з гонарам прадоўжыць справу Дружыны.

Мы чакаем вас, улюбёных у прыроду, узнёслых, стойкіх юнакоў і дзяўчат. А пакуль што ўдач і перамог у вашым нялёгкім выпрабаванні на ўступных экзаменах нашага факультэта.

**Ад імя Дружыны па ахове прыроды —**
**М. БЛЯХЕР,**
**студэнт трэцяга курса.**

## НЕПРЫМІРЫМЫЯ, ПРЫНЦЫПОВЫЯ

**ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ**

Дружына біяфака ГДУ па ахове прыроды аказвае нам, работнікам лясной гаспадаркі, вялікую практычную дапамогу і маральную падтрымку ў барацьбе за захаванне лесу прыгараднай зялёнай зоны. Тут важна адзначыць, што студэнты самі з'яўляюцца ініцыятарамі гэтай высакароднай справы. Дружына прапануе супрацоўніцтва, грунтуючыся на сваіх планах і пераканannях.

З якім захапленнем гэтыя мілыя, дасціпныя дзяўчаты і юнакі абараняюць кожную бярозку, нястомна праводзяць гутаркі! Размаўляюць спакойна, а калі трэба, дык і строга. Яны расказваюць пра значэнне лесу, аб выніках нядобрых адносін да яго, растлумачваюць правілы паводзін на прыродзе, адказваюць на мноства пытанняў. Рабяты прынцыповыя і непрымірымыя да парушальнікаў. Такім добрым сэрцам можна даручыць лёс прыроды нашай Радзімы.

Вялікае вам дзякуй, дарагія сябры!

**М. АРЛОЎСКАЯ,**
**інжынер аховы лесу Ленінскага доследнага лясгаса.**

